ДАНІНА ПАМЯЦІ

***

**Шаноўныя сябры, прапануем вашай увазе чарговы выпуск рубрыкі “Даніна памяці” нашага сайта. У ім мы хочам расказаць пра жыццёвы і творчы шлях цудоўнага чалавека, слонімскага паэта Івана Сяргейчыка. Іван Лук’янавіч Сяргейчык – наш калега па Саюзу пісьменнікаў Беларусі, ветэран вайны ў Афганістане, таленавіты літаратар. Але, на вялікі жаль, пакінуў гэты свет вельмі рана. Засталося тое, што мы абавязаны шанаваць. Засталіся кнігі, публікацыі, фотаздымкі... Засталася памяць. Пры падрыхтоўцы рубрыкі выкарыстаны матэрыялы, якія сабрала і падрыхтавала для публікацыі кіраўнік Слонімскага раённага літаратурнага аб'яднання імя Анатоля Іверса, член СПБ, паэтэса Ірына Войтка. За дапамогу ў падрыхтоўцы дадзенага выпуску тэматычнай рубрыкі мы сардэчна дзякуем Ірыне Антонаўне. Мы таксама выказваем падзяку вучням гуртка "Краязнаўства" пры Слонімскім раённым цэнтры дзіцячай творчасці і кіраўніку гуртка Дзіяне Віктараўне Бярозе за прадстаўленыя даследчыя і архіўныя матэрыялы. Ад усяго сэрца мы дзякуем усім, хто прысвяціў гэтаму чалавеку свае творы, хто памятае Івана Лук'янавіча Сяргейчыка і захоўвае памяць аб ім.**

# Жыў для людзей

***Аб творчай дзейнасці члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, воіна-інтэрнацыяналіста Івана Сяргейчыка (1949-2006)***

*Выканалі:*
*навучэнцы гуртка*
*“Краязнаўства”.*
*Кіраўнік :*
*педагог дадатковай адукацыі*
*Дзіяна Віктараўна БЯРОЗА.*

*Упраўленне адукацыі Слонімскага райвыканкама*
*Дзяржаўная установа адукацыі*
*“Слонімскі раённы цэнтр дзіцячай творчасці*
*“Скарбніца”*

***Рэспубліканскі конкурс творчых работ***
***“Мае землякі – мой гонар”.***
*Намінацыя : “Гонар і слава маёй Бацькаўшчыны”.*

**“Мабыць, найскладанейшая і найпрацейшая “навука” для кожнага – у любых абставінах заставацца чалавекам, не схібіць у сваёй хадзе сярод людзей, не страціць дабрыню, быць шчодрым у думках і справах, мужна пераносіць усё, што пасылае лёс…”**

***Уладзімір Саламаха***

Чалавек нараджаецца для жыцця. Жыццё – гэта радасць і смутак, смех і слёзы, каханне і нянавісць, асалода і пакуты, надзея і адчай, багацце і беднасць матэрыяльная і духоўная.

Жыццё недаўгавечнае, як подых ветру. Яно ў кожным з нас, пакуль мы жывем на белым свеце. І кожны з нас спадзяецца жыць не проста доўга, а бясконца доўга, марыць пра вялікія здзяйсненні. І жыццё раптам абрываецца ў дарагіх нам людзей…

Але пасля смерці застаюцца яны у сваіх здзяйсненнях, дасягненнях, ў сваёй творчасці…

Жыццё даецца, каб жыццё тварыць.
Каб светла-залатую яго ніць
віць і далей — любоўю, справай дзейнай
ды словам, што ад справы неаддзельна.
Тварыць!

Жыццё даецца, каб жыццё тварыць.
Надзеяй, праўдай, мужным парываннем,
высакародным, дружным намаганнем,
што потым зоркай у вяках гарыць.
Тварыць!

Жыццё даецца, каб жыццё тварыць.
Маральны самы, самы натуральны
пачатак гэты вось жыццестваральны.
Інакш — якая ад жыцця карысць?
Тварыць!

Жыццё даецца, каб жыццё тварыць.
Не марнаваць, не нішчыць, не бурыць, —
Тварыць!

*Анатоль Вярцінскі*



Нашу работу “Жыў для людзей” мы прысвячаем памяці таленавітага пісьменніка Слонімшчыны, песняра мужнасці і сапраўднай доблесці і проста добрага чалавека - Івана Лук’янавіча Сяргейчыка.

Нарадзіўся Іван Лук’янавіч Сяргейчык у вёсцы Вострава на Зельвеншчыне 17 жніўня 1949 года. Так склаўся лёс, што дзяцінства яго прайшло ў вёсцы Пустаборы. Вучыўся ў Пустаборскай пачатковай і Галынкаўскай сярэдняй школах. Пісаць вершы пачаў яшчэ ў трэцім класе, калі вучыўся ў Пустаборскай пачатковай школе. Аднойчы на ўроку беларускай мовы настаўніца, Аляксандра Сцяпанаўна Цвікевіч, убачыла лісток паперы, на якім быў напісаны верш “Ручэй”. Праз некаторы час вершы пачынаючага паэта змяшчаліся ў школьнай насценнай газеце. Аляксандра Сцяпанаўна з гэтага часу стала яго першым памочнікам, крытыкам і рэдактарам. “Гэта яе заслуга, - гаварыў Іван Лук’янавіч, - што я сёння пішу, што ўлюблёны ў роднае слова, у родныя, блізкія і дарагія сэрцу краявіды”.

***

Мой слаўны горад – помнік даўніны,
Сівых вякоў бясцэнная карцінка!
Я – твой мураш, тваёй зямлі пясчынка,
Нашчадак тых, хто не прыйшоў з вайны.
З табою лёс свой я заўжды дзялю.
Я – сын, і за цябе я гонар маю.
ЦЯБЕ на шчасце я благаслаўляю,
І кроўю прашчураў, палітую ЗЯМЛЮ!

*Іван Сяргейчык . Слоніму.*

Першым надрукаваным творам быў верш на рускай мове “Перед революцией” у Слонімскай раённай газеце “За перамогу камунізму” у 1972 годзе.

З успамінаў Івана Лук’янавіча: “Універсітэцкіх навук не праходзіў, не было калі, да ўсяго трэба даходзіць самому. Змалку хлеб сваім мазалём зарабляў. Пасля школы скончыў Слонімскае прафесійна-тэхнічнае вучылішча. Стаў механізатарам. Працаваў у калгасе, на будоўлі аўтадарог у Сярэдняй Азіі. А потым – войска”.

З 1968 па 1990 гг. служыў у радах Савецкай Арміі. Суровы лёс выпаў на долю пісьменніка. У былыя савецкія часы ён служыў у арміі ў нашым родным Слоніме. Потым двойчы яму давялося ўдзельнічаць у вайне Афганістана ( у 1981-83 г.г. і ў 1989 г.), глядзеў смерці ў вочы, быў паранены. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі. Вайна – сташная рэч. Яна пакінула ў жыцці Івана Лук’янавіча глыбокі след. Гінулі сябры на вачах, часам і яму даводзілась быць на валасок ад смерці. Перажыванні, думкі, жудасць той вайны - гэта люстэрка яго творчасці.




***У часы службы ў арміі. “Сам змайстраваў пульт кіравання ў часці – і салдатаў вучыў.***

***
Как часто нас мучает боль
Неутихшей афганской войны -
Бурлящий поток,
Миномётные вспышки с другой стороны…
Мне врезалась в память
Дырявая фляжка, последний глоток,
Который твой друг,
От себя отрывая, мальчишке сберёг…

*І. Сяргейчык. Памяць.*







***У час баявых дзеянняў. Люты 1982 г.***

Іван Лук’янавіч пра афганскую вайну сказаў сваю праўду ў кніжцы-дзённіку “Горкі пыл Гіндукуша”.

Іван Сяргейчык - пісьменнік-салдат. У Беларусі ён быў першы. Не па выхаду кнігі, а па часе яе напісання.

“У гэтыя часы існавалі своеасаблівыя адносіны да афганскай тэмы – ніякай праўды. Вядома, што ў Маскве была група літаратараў, якім нібыта “вменялось” у творчыя планы пісаць

пра афганскую вайну, і нават як! Таму пасля іх прачытання нічога не кранала, бо адчуваўся фальш, няпраўда,” - зазначаў Уладзімір Саламаха.

А Іван Лук’янавіч стаў адным з першых беларускіх пісьменнікаў, хто пачаў сапраўды праўдзіва “асвойваць” афганскую тэму. Пасля іншыя і іншыя літаратары пісалі пра тую вайну. Кожны – па-свайму. Зыходзячы з уласнага вопыту, з меры таленту, адпушчанага кожнаму.

“Людзі кажуць, што самае лёгкае – гэта гаварыць, або пісаць праўду. Ці змагу я напісаць яе, афганскую праўду? Якая яна ёсць там, калі тут ад усяго што бачыш і чуеш, апускаюцца рукі?...” – пачынаецца дзеннік.

Афганскі дзеннік былога воіна-інтэрнацыяналіста пісаўся на самым пачатку тады яшчэ мала вядомай нам “афганскай вайны”. Усе, пра што пісаў аўтар, ён сам пераўжыў, быў ТАМ не на экскурсіі, а як непасрэдны ўдзельнік.




Апошняя кніга Івана Сяргейчыка “Без права на літасць” выйшла ў 2006-ым годзе. Пад вокладкай гэтай кнігі сабраны амаль усе творы пісьменніка на афганскую тэму.

Чытаючы творы Івана Лук’янавіча сапраўды задумваешся над пытаннем: “Хто ўсё ж такі ў той вайне меў права на літасць?” Адказ гучыць у творах – “зямля афганская і шматпакутны народ яе…” “Агонь і дым гэта страшная рэч… Нават сёння жудасна і страшна успамінаць той дзень. А яшчэ страшней успомніць, што з роты капітана Сіліна ў жывых засталося толькі дзесяць чалавек. Свая кроў заўсёды даражэй, чым чужая. Чаму так цяжка зразумець кошт чужой крыві? Ці бачылі колер крыві тыя, хто пасылаў нас выконваць гэты інтэрнацыянальны абавязак?” Гэтымі радкамі заканчваецца афганскі дзённік Івана Лук’янавіча Сяргейчыка.

Яшчэ ніхто ніколі не вызначыў, калі, у які час нараджаецца пісьменнік. Уладзімір Саламаха, лаурэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь і сябар Івана Сяргейчыка, так піша ў прадмове да кнігі “Без права на літасць”: “Упэўнены, ведаючы якім было дзяцінства і юнацтва Івана Сяргейчыка, а таксама тое, як ён з маленства ўспрымаў свой і чужы боль, што тады якраз і нарадзіўся талент пісьменніка ў душы майго сябра”…

Усё пачынаецца з дзяцінства. Першая несправядлівасць. Першы боль. Першае расчараванне. Першае каханне. Толькі блізкія сябры мелі магчымасць ведаць аб гэтым. А вось аб тым, што звязвала пісьменніка з Беларуссю нашай мілаю, мы можам прачытаць у яго вершах і прозе, якія раскінуліся, нібы пацеркі па розных выданнях. А гэта ні многа ні мала: рэспубліканскія часопісы :
“Маладосць”;
“Полымя”;
“Акно”;
“Карані”;
зборнікі “Золак над шчарай”;
“Галасы” і інш.




Матэрыял аб творчай дзейнасці Івана Сяргейчыка змяшчаўся на старонках многіх газет.

Два апавяданні Івана Сяргейчыка аб афганскай вайне былі змешчаны ў літаратурным альманаху Слонімшчыны “Золак над Шчарай”, які выйшаў у свет у 1994 г. Выхад гэтай кніжкі – сапраўднае свята, бо падобных выданняў ранней не выпускалася ў Слоніме. Золак – гэта самы пачатак дня, світанне. Гэты пачатак быў светлым, аптымістычным. За першым слонімскім літаратурным зборнікам амаль праз адзінадцаць год, у 2005 годзе, выйшаў другі – “Пад гукі паланэза”, яшчэ больш цікавы, шырэй напоўнены разнастайнымі краязнаўчымі і літаратурнымі матэрыяламі, укладальнікамі якога быў Іван Лук’янавіч.

Мой кудзелькавы край –
Ільняная радзіма…
Тут ступіў я ў жыццё
Па світальнай расе,
Плаваў у морах чужых,
Як ашчэпак ільдзіны,
Пакуль зноў
На зямельцы бацькоў не асеў…
Я народжаны
Прашчураў сілу прымножыць.
У збудаванай хаціне –
Шчасце гнёздышка ўе.
Я калодзеж з крыніцы
Зрабіў пры дарозе –
Няхай людзям
Жывільныя сілы дае.

*І.Сяргейчык. Паклон.*



***Родная Слонімшчына***

І сапраўды: кудзелькавы ранак, ільняное раздолле, з пахам хлеба жытнёвае поле – былі натхненнем паэта Івана Сяргейчыка. І гэта не проста правінцыяльны паэт, а пісьменнік Беларусі. У 1995-ым годзе ён быў прыняты ў Саюз беларускіх пісьменнікаў.

Наш край багаты на літаратурныя таленты. Са Слонімскай зямлёй звязаны імёны знакамітых пісьменнікаў і паэтаў, сярод якіх:
Валянцін Таўлай;
Сяргей Новік-Пяюн;
Алесь Сучок;
Анатоль Іверс;
Алег Лойка;
Мікола Арочка;
Васіль Супрун;
Сяргей Чыгрын;
Янка Карповіч;
Алена Ржэуцкая і іншыя.

На змену старэйшаму пакаленню ў кагорту пісьменнікаў прыйшло маладое папаўненне, якое працягвае традыцыі таленавітых папярэднікаў-землякоў.

Слонімскія аўтары паставілі перад сабою мэту апавядаць людзям, побач з якімі жывуць, пра тое, пра што ведаюць добра – пра свой Слонім, пра сябе і гэтых людзей – сяброў, суседзяў.

Іван Лук’янавіч здолеў аб’яднаць людзей, сталога веку і творчую моладзь Слонімшчыны: захаваць памяць пра паэта-земляка Анатоля Іверса, надаўшы яго імя літаратурнаму аб’яднанню.



...мскі веснік — 4 красавіка 2002 года

...німскія зарніцы

## Новы кіраўнік літаб’яднання

І. Сяргейчык. Э. Руж. І. Пракоф’еў. І. Войтка. І. Міхалькевіч. І. Ясінскі.

Многія нашы чытачы захапляюцца літаратурай, спрабуюць свае здольнасці ў напісанні вершаў і расказаў, дасылаюць свае творы ў рэдакцыю. Імёны некаторых мясцовых пісьменнікаў добра ведаюць нашы землякі, бо творы больш таленавітых аўтараў часта з’яўляюцца на старонках нашай газеты.

Нядаўна прайшло пасяджэнне літаб’яднання, на якім прысутнічалі людзі розных узростаў, хто спрабуе свае сілы ў паэзіі і прозе. Мясцовыя пісьменнікі гаварылі аб сваіх творчых здабытках, чыталі ўласныя вершы. Са сваімі новымі творамі прысутных пазнаёмілі Таццяна Гайдук, Ігар Пракоф’еў, Іван Скугараў, а Іван Ясінскі нават выканаў свае песні.

У размове ўдзельнічалі член Саюза пісьменнікаў Беларусі Іван Сяргейчык, а таксама Ірына Войтка, Рыма Міско, Таццяна Тарасік, Ірына Міхалькевіч, Элен Руж (Ржауская), галоўны рэдактар газеты “Слонімскі веснік” Марыя Данюк і іншыя.

Асноўным пытаннем на сходзе было выбары кіраўніцтва літаб’яднання. Старшынёй літаб’яднання выбраны вядомы пісьменнік Іван Сяргейчык, яго намеснікам стала мясцовая паэтэса Ірына Войтка. На Рыму Міско ўскладзены арганізацыйныя пытанні.

І ў далейшым на пасяджэннях літаб’яднання будзе аналізавацца творчасць прыхільнікаў літаратурнай творчасці, пачынаючыя аўтары атрымаюць падказкі больш вопытных мясцовых пісьменнікаў.

**Сяргей ПРАСНЯК.**

***Газета “Слонімскі веснік”ад 4 красрвіка 2002 г.***
***Новы кіраўнік літаб’яднання.***

“З ім было лёгка, проста і надзейна. З’яўляючыся кіраўніком літаб’яднання, Іван Лук’янавіч сам вёў справаводства, рэдагаваў творы аўтараў, дапамагаў ім выдаваць кнігі, праводзіў прэзентацыі, любіў сяброўскія сустрэчы і падарожжы. Пры гэтым не выносіў графаманства, невуцтва і хамства” – адклікаліся калегі.



***Сустрэча з мінскімі літаратарамі.***

Ірына Антонаўна Войтка – кіраўнік літаб'яднання імя Анатоля Іверса, успамінае: "Яго любілі ўсе, хто ведаў: у друкарні, дзе ён у свой час працаваў загадчыкам гаспадаркі; у рэдакцыі газеты "Слонімскі веснік", куды прыносіў свае артыкулы; у цэнтры дзіцячай творчасці "Скарбніца", дзе кіраваў літаратурным гуртком; у дзіцячым садку, куды Іван Лук'янавіч захоздіў да мяне, каб сустрэцца, пагаварыць пра планы літаратурнага аб'яднання. Вось такі ен быў: імклівы, праўдзівы, працавіты".

Вырвуся да людзей,
Як да вяршыняў Храма.
Людзі заўсёды ёсць
Чыстыя, быццам Храм.
Для іх і вясна – абуджэнне,
Для іх і любоў – нараджэнне,
Для іх і жыццё – спасціжэнне
Высокае, быццам Храм.

*Ірына Войтка. І.Л.Сяргейчыку.*

Іван Лук'янавіч Сяргейчык цесна супрацоўнічаў з рэдакцыяй гумарыстычнага часопіса "Вожык". У лістападзе 2005 года ў ЦДТ "Скарбніца" адбылася сустрэча "вожыкаўцаў" са слонімскімі школьнікамі, якая была арганізавана пісьменнікам.





***Сустрэча рэдкалегіі журнала "Вожык"са слонімскімі талентамі.***



***Навучэнка Івана Лук'янавіча Ларыса Нагапецян чытае свае вершы.***

Трэба адзначыць, што Іван Лук’янавіч цесна супрацоўнічаў з цэнтрам дзіцячай творчасці. І ў пачатку 2005 навучальнага года распачаў сваю дзейнасць літаратурны гурток, створаны па ініцыятыве Слонімскага літаб’яднання імя Анатоля Іверса пры установе пазашкольнага выхавання і навучання “Скарбніца”. З юнымі прыхільнікамі літаратуры і пачынаючымі літаратарамі заняткі праводзіў член Саюза беларускіх пісьменнікаў, кіраўнік Слонімскага літаб’яднання Іван Лук’янавіч Сяргейчык. Хлопчыкі і дзяўчынкі з гарадскіх школ спасцігалі нялёгкую, але даволі цікавую і захапляючую навуку, якая называецца літаратурнай творчасцю. Іх поспехі радавалі кіраўніка. Лепшыя творы змяшчаліся на старонках газеты “Слонімскі веснік” і гучалі ў літаратурных перадачах на раённым радыё.

Іван Лук’янавіч так адзываўся аб сваім гуртку: “Гэта вельмі надзейны, жыццярадасны ручаёк, які па разліку павінен напоўніць дзейнае рэчышча творчых асоб літаб’яднання”.

Адзін з яго таленавітых вучняў, Аляксандр Лойка, стаў членам літаб’яднання імя Анатоля Іверса.

Вось калі б вярнуць з небыцця Івана Лук’янавіча, то яго вучні, сказалі б яму, як многа ён значыў у жыцці для іх, як многа ён зрабіў для хлопчыкаў і дзяўчынак, якія прыходзілі да яго з адкрытай душой, чыталі яму свае творы і з хваляваннем чакалі яго парады, прыслухоўваліся да кожнага яго слова, заглядвалі ў яго вочы, спадзеючыся пачуць пахвалу. І яны яе атрымлівалі. Ён умеў натхняць на новыя творы, паверыць у свае сілы.



Іван Лук’янавіч вельмі любіў моладзь, дзеля якой і быў сапраўдным настаўнікам. А моладзь цягнулася да яго, як да бацькі. Нездарма ён на апошнім годзе свайго жыцця выдаў арыгінальную кнігу (запланаваўшы серыю) аб адоранай моладзі Слонімшчыны “Сцяжынка школьная мая”.




Амплуа, у якім выступіў пісьменнік незвычайная: пасля асэнсавання цяжкіх падзей афганскай вайны - да кнігі-аповеда праз адораных дзяцей роднай Слонімшчыны. Чалавецтву добра вядома, што нараджэнне месяца-маладзіка дае сусвету новае жыццё, рэгулюе яго функцыі ў прыродзе. Як асэнсаваў сам аўтар гэту з’яву ў ягоным жыцці: “ Перавод рэгулятара пачуццяў уласнай свядомасці з балючых для душы і праз гады падзеі афганскай вайны на маладзіковую сучаснасць – справа невымяральна складаная але вельмі неабходная”.
Пад адной вокладкай сабраны лёс і талент, думкі і спадзяванні, надзеі і перамогі тых, каго ўжо сёння можна назваць будучыняй нашай краіны.

Хлопцы, дзяўчаты, пра якіх расказвае пісьменнік Іван Лук’янавіч Сяргейчык, ужо спазналі смак тых перамог, якія дасягаюцца шляхам самаадданай працы і самаўдасканалення.

Каб кветкі выраслі, неабходна ўрадлівая глеба і цёплыя ласкавыя праменьчыкі сонейка. Урадлівай глебай для юнакоў з’яўляюцца іх школы, а сонечнымі праменьчыкамі – настаўнікі.

Дык хто яны, героі Івана Лук’янавіча? Гэта школьнікі: пераможцы раённых, абласных, рэспубліканскіх алімпіяд, конкурсаў, спаборніцтваў: хімікі, фізікі, літаратары, спартсмены, спевакі, музыканты і танцоры, лепшыя вучні класаў і школ нашага горада. Гэта тыя, кім ужо сёння ганарацца бацькі і настаўнікі.

Усведамляючы важнасць такога выдання для будучыні нацыі, для прыкладаў маладых, прадмову для кнігі напісала былы начальнік упраўлення адукацыі Слонімскага райвыканкама Галіна Іванаўна Шмялёва.

Чытаеш невялікія апавяданні, з якіх складаецца “Сцяжынка школьная мая” і міжволі пачынаеш ганарыцца сваёй краінай: калі толькі на Слонімшчыне столькі адораных, таленавітых дзяцей, што ўжо казаць пра ўсю Беларусь!

Аўтар кнігі, пісьменнік, якому ў маладыя гады давялося прайсці праз Афганістан, не па чутках ведае каштоўнасць мірнага, шчаслівага жыцця. Напэўна, таму ён і прысвячае сваю кнігу дзецям, бо ад іх залежыць, якой будзе “будучыня нашай краіны, будучыня народа – лёс нацыі”.

Ёсць пісьменнікі, чые імёны становяцца вядомымі чытачу ўжо з першых публікацый: прачытаеш апавяданне, верш – і запомніў назаўжды. І нават калі потым, праз гады, іх творы сустракаеш не так ужо і часта, ведаеш: цікавы, самабытны, чымсці прывабны аўтар. Да такіх мы і адносім Івана Сяргейчыка.

Іван Лук’янавіч заўчасна пайшоў з жыцця. Цяжкая і невылечная хвароба забрала ў родных і сяброў гэтага інтэлігентнага, добрага чалавека. Трэццюю вайну з нябачным ворагам воін-афганец Іван Сяргейчык не здолеў выйграць. Лёс… Так кажуць… Але для яго сяброў, вучняў, і для людзей , якія проста ганарыліся такім талентам Слонімшчыны, Іван Лук’янавіч застаецца жывы. Мы памятаем яго словы, яго парады, яго творчасць.

Як цяжка гаварыць пра Вас, Іван Лук’янавіч, у мінулым часе, як многа Вы змаглі б зрабіць у будучым…БО ВЫ ЖЫЛІ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ!

*Казімір Камейша*

# САМОТА

*Памяці Івана Сяргейчыка*

Самота… І круг твой замкнуўся
Акрайкам апошняй вярсты.
Тры залпы сухога салюта
І чаркі самотныя тры…
У медзь адліваліся гукі,
Каб выбухнуць тут жа, як гром.
Пяклася падушачка ў рукі
З тваім баявым медалём.
І бор векавечны над Шчарай,
Што помніць вайну не адну,
Літаўрамі лісця ударыў
І болем душу скалыхнуў.
У выдмах глухіх Гіндукуша
Дыміўся, як танк успамін,
І птушкамі родныя душы
Сышліся над крыжам у клін.
Жыццё – як бясконцае поле
Для бітваў, для дзей і самот.
А, можа, працяг толькі бою
За вечнасць Айчыны самой…

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

Сяргейчык І.Л. “Горкі пыл Гіндукуша” Афганскі дзеннік.-Мн. Выдавецтва ЦК КПБ., 1991.
Сяргейчык І.Л. “Абавязак перад памяццю”. Інтэрв’ю узяў С. Чыгрын //Праца.-1991г. 6 ліеня.
Сяргейчык І.Л. “Крыж журавоў”: Верш.//Праца. - 1989г. 23 лютага.
Сяргейчык І.Л. “Без права на літасць”. Аповесці і апавяданні. – Слонім: Слонім. тіп., 2006.
Сяргейчык І.Л. “Сцяжынка школьная мая…” Кн. 1. – Слонім: Слонім. тіп., 2005.
“Пад гукі паланэза”: літ. альм./ уклад. Сяргейчык І.Л.. – Слонім: Слонім. тіп., 2005.
“Золак над Шчарай”: літ. зборнік членаў Слонімскага літаб’ яднання. – Слонім: Слонім. тіп., 1994.

урывак

„Полымя“ № 5 200



14

Старшы сяржант Лавада разглядваў горы, абапёршыся на скалу, да таго часу, пакуль не знямелі рукі.

У міжгор'і ўсе было як быццам спакойна. Здавалася, што гэтую мёртвую цішыню спрадвеку ніхто не парушыў і ніколі не парушыць. Якія тут могуць быць душманы? Галодныя шакалы і тыя не адважацца трапіць сюды. Хмары, скалы, снег і цішыня. І цішыня... Яна непакоіць, хвалюе. Іншы раз думаецца, што ад яе можна страціць розум. Яна — прадвеснік смерці.

Лавада зірнуў на гадзіннік. Праз пяць хвілін ён павінен далажыць ротнаму. Аб чым дакладваць?

Настрой быў ніякі. Гняло яшчэ і тое, што не было чуваць выбухаў. Няўжо адмянілі авіяўдар?

Адтуль, дзе ляжаў Бабоеў, пачуўся лёгкі стук. Лавада павярнуў галаву. Бабоеў, убачыўшы, што Лавада зрэагаваў на ягоны кліч, паказаў рукою на вуха, а пасля пакруціў рукою ў паветры.

«Вяртушкі», — здагадаўся Лавада. — Бабоеў пачуў гук «вяртушак». Значыць, авіяўдар будзе.

Лавада схапіў бінокль. Перад вачамі зноў з'явілася галава кальмара, а за ею парадзелая хмарная шэрань. «Дык вось чаму затрымалі авіяўдар, — мільганула здагадка. — Хмары. Усе з-за непагоды».

Цяпер і Лавада пачуў рокат верталётаў. Далёкі, але выразны гук то нарастаў, то аддаляўся. Дакацілася рэха частых выбухаў. Душу Лавады напоўніла хваля радасці. Нават сэрца зачасціла ад яе.

І раптам усе абарвалася. Справа, на згібе хрыбта, Лавада ўбачыў у паветры сцяну снежнага пылу. Яна выразна віднелася на фоне горных скалаў. «Няўжо сышла лавіна? Ад чаго? Ад выбухаў?.. Дык яны далёкія...» — Лавада губляўся ў здагадках, напружваючы зрок. У неглыбокім распадку ўгледзеў тры невялікія чалавечыя постаці. Хто гэта? Людзі корпаліся ў снезе, мітусіліся. Душманы!

Рука Лавады пацягнулася да рацыі.

— Вышыня, я — трэці. Бачу душманаў... Траіх... Адлегласць?.. Каля трох... Адлегласць?.. Каля трох. Справа. Толькі на мяне. Злева — глыбокая цясніна... Снайпера і пару аўтаматычных гранатамётаў...

Даклад пачуў і Бабоеў. Клацнуў затворам кулямёта.

Лавада не зводзіў вачэй з душманаў. Так, ён быў упэўнены, што перад ім душманы. Магчыма, гэта адна з груп, што выйшла з цясніны першай. Тады пры чым тут снежная лавіна? Яна правей і бліжэй...

Роздум абарваў кароткі свіст мін, і за спіной прагрымела некалькі выбухаў. Лавада азірнуўся. Зноў свіст і новыя выбухі. Клубы агню і дыму ўзняліся ў неба на пазіцыі роты і перад ёю. Дрыжэла зямля. Выбуховыя хвалі білі па вушах. Асколкі высякалі са скалаў касякі іскраў, нібы крэсівам.

Бінокль Лавады зноў намацаў тры постаці. Цяпер над імі вісеў лёгкі дымок. «Мінамёт. Гэта мінамёт. Снайпера б сюды!..»

Абстрэл мацнеў. Міны рваліся на пазіцыях роты часцей і часцей. Нехта карэкціраваў агонь.

Лавада закіпаў ад злосці і бяссілля, што не можа дапамагчы сябрам. Абстрэл не стрымаць. Секунды здаваліся вечнасцю. Абстрэл не мог працягвацца доўга. Мін з сабою многа не панясеш. Значыць, ён хутка сціхне і адразу можа пачацца атака. Адкуль?..

Вочы шукалі ворага, і Лавада ўбачыў яго.

Бліжэй ад таго месца, дзе была прыкмечана снежная лавіна, рухаўся шчыльны ланцужок людзей. Яны беглі ў напрамку Лавады да шчыліны паміж скаламі. Яшчэ кідок — і «духі» будуць недасягальнымі. А кулямёт Бабоева маўчаў.

На роздум не заставалася часу. Хутчэй даць Бабоеву напрамак агню. Лавада схапіў са скалы аўтамат. Насустрач «духам» паласнула доўгая шчыльная чарга. Пярэдніх зрэзала нітка трасераў. Наступныя стоўпіліся на вузкай сцяжыне, збіваючы адзін аднаго з ног. А паратунку не было. Улева не пускала адвесная скала, управа — глыбозны абрыў. Падаць туды «духам» не хацелася. Заставалася адзінае — наперад.

Новы кідок ворага спыніў кулямёт Бабоева.

# ЗАСТАЎСЯ НАЗАЎСЁДЫ ЧАЛАВЕКАМ...



Мабыць, найскладанейшая і найпрасцейшая "навука" для кожнага — у любых абставінах заставацца чалавекам, не схібіць у сваёй хадзе сярод людзей, не страціць дабрыню, быць шчодрым у думках і справах, мужна пераносіць усё, што пасылае лёс...

Пра гэта калісьці гаварыў мне воін, пісьменнік, грамадзянін і проста добры чалавек Іван Сяргейчык, калі з першага знаёмства сышліся мы па-сяброўску з ім у рэдакцыі тагачаснай "Маладосці". Тады яшчэ пачынаючы празаік толькі што вярнуўся з малавядомай для нас на той час афганскай вайны. І з першых хвілін размовы асабіста ў мяне было такое адчуванне, што ведаем мы адзін аднаго з дзяцінства, і няма між намі нічога такога, што перашкаджала б паразумецца...

Настаўнік не аднаго пакалення нашых празаікаў Уладзімір Максімавіч Дамашэвіч якраз перад гэтым перадаў мне раней дасланыя апавяданні Івана Сяргейчыка, каб я іх прачытаў і падрыхтаваў да друку.

Прачытаў і быў уражаны: адкрыўся мне своеасаблівы пісьменнік, радок якога не фальшывіў — а гэта, мабыць, кожны з нас адчувае, маючы хоць якое дачыненне да літаратуры. Усё, пра што пісаў аўтар, ён сам перажыў, быў ТАМ не на экскурсіі, а як непасрэдны ўдзельнік...

Пра ўдзельнікаў той вайны гаварылася рознымі аўтарамі і па-рознаму, часта на свой капыл, іншы раз ва ўгоду абставінам, а часам з выгодай для сябе. Іван жа пра афганскую вайну сказаў сваю праўду ў кніжцы-дзённіку ці не першай у Беларусі пра тую трагедыю. "Горкі-пыл Гіндукуша" выйшла у № 3 за 1991 год у бібліятэцы часопіса "Маладосць". Уся рэдакцыя часопіса: рэдактар аддзела прозы Васіль Гігевіч, тагачасны намеснік галоўнага рэдактара Генрых Далідовіч, наш галоўны — Анатоль Грачанікаў пачалавечы адобрылі і блаславілі яе ў друк.

Дык вось, "сышліся" мы з Іванам, як кажуць, спачатку завочна, а сустрэліся, калі ён прыехаў з той вайны дадому, у Слонім, дзе жыла яго сям'я. А ў Мінск, у "Маладосць" завітаў разам са сваім сябрам Рудольфам Пастуховым, якога я ведаў як чалавека, што прайшоў зусім не піянерскую лагерную школу, ды застаўся чалавекам, нягледзячы ні на што. Добрыя, адкрытыя твары Івана і Рудольфа: аднаго — воіна, другога — былога зэка (не па сваёй волі) нібы казалі, што людзі застаюцца людзьмі ў любых сітуацыях. І гэта зблізіла нас.

Рудольф таксама дачасна, як і Іван пайшоў з жыцця, застаўшыся ў памяці ўсіх, хто яго ведаў, нескароным, шчырым і добрым, мяккім і мудрым.

І вось цяпер не стала Івана Сяргейчыка. Цяжкая і страшная хвароба забівала яго штодня невыноснымі пакутамі, і мы гэта ведалі, асабіста я — ад яго жонкі Валянціны Кірылаўны, з якой перазвоньваліся не будучы асабіста знаёмымі. ...Валянціна Кірылаўна, як і Іван Лук'янавіч, сірата, не згубілася сярод людзей, шмат чаго пабачыла ў жыцці і многа чаго перажыла. Яна з тых нашых Мадоннаў, жанчын і маці, на якіх і трымаецца жыццё. Яна зрабіла ўсё для таго, каб сям'я была трывалаю, каб дзеці выраслі добрымі людзьмі, а муж, дзе б ні быў, адчуваў: дома яго заўсёды чакаюць.

Гэта яна, як сам казаў цяжкахворы Іван, "здувала з яго пылінкі", яна ж хвораму чытала апошні пры жыцці яго надрукаваны твор — аповесць у пятым нумары "Полымя" за гэты год, калі ўжо сам пісьменнік чытаць не мог...

Паклон Вам, Валянціна Кірылаўна, ад нас: Казіміра Камейшы, Паўла Саковіча і асабіста мяне, каго Іван лічыў сябрамі, і ўдзячнасць наша за шчырасць Вашу, за магчымасць размаўляць аб тым, што застаецца толькі між блізкімі людзьмі...

А Вашаму Івану, нашаму Івану Лук'янавічу — светлая памяць і пухам зямля.

**Уладзімір САЛАМАХА**

**ЗАХАРАВА, 19**



**Пішыце на адрас: 220034, Мінск, вул. Захарава, 19, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва»;**
**e-mail: minsk@lim.bu**
**Адрас у Інтэрнеце — www.lim.bu**

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва»

*—прымае да разгляду выдавецкія праекты самай шырокай тэматыкі;*
*— выканае ўвесь спектр рэдакцыйна-выдавецкіх паслуг;*
*— арганізуе рэкламу і прэзентацыю выданняў.*
*Вул. Захарава, 19,*
*тэл.: 284-79-65*
*Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць №02330/0056810 ад 2 сакавіка 2004 года, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.*

# ЯГО ЛЮБІЛІ ЎСЕ

Яго любілі ўсе, хто ведаў: у друкарні, дзе ён у свой час працаваў загадчыкам гаспадаркі, у рэдакцыі газеты "Слонімскі веснік", куды прыносіў свае артыкулы, у цэнтры пазашкольнай навучальнай работы "Скарбніца", дзе кіраваў літаратурным гуртком, у дзіцячым садку, куды Іван Лук'янавіч заходзіў да мяне, каб сустрэцца, пагаварыць пра планы літаратурнага аб'яднання. Вось такі ён быў: імклівы, праўдзівы, працавіты. А яшчэ за плячыма ў яго была афганская вайна.

Іван Лук'янавіч Сяргейчык здолеў аб'яднаць людзей сталага веку і творчую моладзь Слонімшчыны: захаваць памяць пра паэта-земляка Анатоля Іверса, надаўшы яго імя літаратурнаму аб'яднанню, выдаць два літаратурныя альманахі "Золак над Шчараю" і "Пад гукі паланеза".

З ім было лёгка, проста і надзейна. З'яўляючыся кіраўніком літаб'яднання, І. Сяргейчык сам вёў справаводства, збіраў матэрыялы, праводзіў пасяджэнні, рэдагаваў творы аўтараў, дапамагаў ім выдаваць кнігі, праводзіў прэзентацыі, любіў сяброўскія сустрэчы і падарожжы. Пры гэтым не выносіў графаманства, невуцтва і хамства. І вельмі любіў моладзь, для якой і быў сапраўдным настаўнікам. А моладзь цягнулася да Івана Лук'янавіча, як да бацькі. Нездарма І. Сяргейчык на апошнім годзе свайго жыцця выдаў арыгінальную кнігу (запланаваўшы серыю) аб адоранай моладзі Слонімшчыны "Сцяжынка школьная мая". А Сашку Лойку "прытуліў" да сябе, намагаючыся даць цяпло сэрцу дзіцяці, якое вырасла без бацькоў.

Як цяжка пра цябе пісаць у мінулым часе, дружа Іван, як многа ты змог бы зрабіць у будучым, як хацеў.

Бо ты жыў для людзей.

**Ірына ВОЙТКА,**
**сябра слонімскага літаратурнага аб'яднання імя А. Іверса**

Казімір КАМЕЙША

## *САМОТА*

**Памяці Івана Сяргейчыка**

Самота... І круг твой замкнуўся
Акрайкам апошняй вярсты.
Тры залпы сухія салюта
І чаркі самотныя тры...

У медзь адліваліся гукі,
Каб выбухнуць тут жа, як гром.
Пяклася падушачка ў рукі
З тваім баявым медалём.

І бор векавечны
над Шчарай,
Што помніць вайну
не адну,
Літаўрамі лісця ударыў
І болем душу скалануў.

У выдмах глухіх Гіндукуша
Дыміўся, як танк, успамін,
І птушкамі родныя душы
Сышліся над крыжам у клін.

Жыццё — як бясконцае поле
Для бітваў,
для дзей
і самот.
А, можа, працяг толькі бою
За вечнасць Айчыны самой...

# ВЯРТАННЕ

З гадамі скрушней становіцца не толькі таму, што менней часу засталося і для цябе. Скрухі более і з таго, што ўсё часцей адыходзяць знаёмыя і блізкія людзі. Памёр і Міхась Фядотавіч Карпенка. Так здарылася-склалася, што не правёў яго ў апошні шлях . Хаця і ведаў пра час развітання. І збіраўся ісці, як наклалася яшчэ адна бяда... Развітваюся зараз. Міхась Фядотавіч доўгія гады працаваў далёка ад роднай Хоцімшчыны — галоўным рэдактарам абласной газеты "Ташаузская правда" ў Туркменістане. Паблізу ад каракалпацкага горада Нукуса. Дарэчы, і кнігі вершаў нашага земляка выходзілі не толькі ў Ашгабаце, але і ў Нукусе, дзе працавала выдавецтва аўтаномнай рэспублікі. Выйшаў на пенсію — вярнуўся ў Беларусь. Купіў хатку ў родным раёне. Пачаліся хваробы. Доўгі час ён, заслужаны работнік культуры Туркменскай ССР, журналіст і літаратар, які беларускім партыйным ЦК быў некалі накіраваны на вучобу ў Маскву, не мог атрымаць грамадзянства ў Айчыне сваёй. Сагравала толькі падтрымка дзяцей — дачкі Алёны і сына Сяргея.

...Вось пераглядаю яго лісты. Ёсць канверты з ташаузскім штэмпелем. А болей — з хоцімскай Чарняўкі. Балючыя лісты. Старасць ніколі не бывае лёгкай. А тут яшчэ, хаця і дахаты, у Беларусь вярнуўся, змянілася атмасфера. Раптам згубіліся сябры, знаёмыя. І пошта ўжо зусім не тая... Лісты, кнігі ад сяброў не заўсёды даходзяць да адрасата. А яшчэ ж з Ашгабата тыя, хто пісаў па-руску, як правіла, раз'ехаліся-разбегліся па розных баках. Так і я многіх не знайшоў са сваіх сяброў-літаратараў па Туркменіі. Не ведаю, дзе карэец Валодзя Пу. Пра новы адрас вядомага гістарычнага раманіста Валянціна Фёдаравіча Рыбіна даведаўся ўжо непапраўна позна. А Аляксандр Гоўберг, Альберт Палякоўскі, Саша Музюкін, Мікалай Залатароў, Ікар Пасеў'еў... Дзе яны!?.

З Міхаілам Фядотавічам моцна сябраваў празаік і паэт Мікалай Данілаў. Дарэчы, адзін з яго гістарычных раманаў — пра першую імперыялістычную вайну ў Беларусі. У красавіку 1998 года Мікалай Сямёнавіч піша мне : "...А вось з Міхасём Карпенкам сувязь ніяк не налажу. Паслаў яму вялікае пісьмо і раман — ні слыху, ні духу. Не прыйшоў адказ і на другі ліст. Нешта не ладзіцца з поштай..."

У Мінску неяк удалося прыватным чынам выдаць невялікую паэтычную кнігу "Мое отцовское поле". Было спадзяванне, што тыраж дапаможа рэалізаваць пэўная структура. Ды абяцанні, наколькі я зразумеў, так абяцаннямі і засталіся. Зрэдчас былі публікацыі ў "Белорусской ниве", хоцімскай "раёнцы"... Усё ж тае, ранейшай, актыўнасці паэта, як і ранейшай увагі да чалавека не было. З-за гэтага я адчуваў сябе ніякавата. Бо трымаў у памяці, якім уважлівым і добразычлівым быў да ўсіх землякоў Міхаіл Фядотавіч у Туркменіі. Падказваў ідэі, тэмы, не шкадаваў плошчы "Ташаузской правды" для літаратурна-мастацкіх публікацый.

А як цягнуліся да Карпенкі туркменскія літаратары — Мамед Сеідаў, Шахер Барджакаў, Керым Курбанпесаў... З усімі ён знаходзіў агульную мову. Ведаю, што доўга ляжала ў адным з туркменскіх выдавецтваў кніга вершаў Міхася Карпенкі ў перакладзе на туркменскую мову. Ды там, на Усходзе, часы змяніліся і ўжо кніга, пэўна, так назаўжды застанецца выдавецкім рукапісам.

Пройдзе час — і ўсё стане па сваіх месцах. Але, як бы ні ставіліся заўтра да напісаных у мінулыя дзесяцігоддзі вершаў сціплага паэта-вандроўніка з вёскі Чарняўка, Міхась Фядотавіч Карпенка на ўсё жыццё застанецца ў маёй памяці як шчыры, сумленны старэйшы таварыш па літаратуры і журналістыцы, па агульных туркменскіх сцежках.

**Алесь КАРЛЮКЕВІЧ**

# СЛОНІМСКІ ВЕСНІК

Газета
Узнагароджана
Ганаровай граматай
Вярхоўнага Савета
БССР
Заснавана 26 верасня 1939 г.

13 ЛЮТАГА 1999 ГОДА * №18(7919) • КОШТ У РОЗНІЦУ ДАГАВОРНЫ • ТЫРАЖ 145 ТЫСЯЧ У МЕСЯЦ

**15 лютага — Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў**

# НЕСУЦІШНЫ БОЛЬ ДУШЫ



Як імкліва і нястрымна ляціць час! Здаецца, зусім нядаўна Савецкі Саюз вывеў з Афганістана свой абмежаваны кантынгент — 40-ю армію. На самай справе з таго дня ўжо мінула 10 гадоў. А шматпакутная зямля "краіны сонца і гор" усё яшчэ працягвае ўздрыгвацца ад узрываў мін, снарадаў і ракет. Вайна ў Афганістане не скончылася. Сёння мне здаецца, што ёй не будзе канца. У канцы 70-х гадоў савецкі народ пад кіраўніцтвам КПСС будаваў камунізм. Будаваў пад кіраўніцтвам сваіх "вялікіх бацькоў". Адны з іх узначальвалі ўрад, а другія былі абраны на больш вышэйшыя пасады — у ЦК КПСС. Сёння мы добра ведаем, якімі былі тады нашы "бацькі". Яны дбалі пра нас, любілі так, што нават цяпер мы саромеемся, а можа і баімся назваць прозвішча вінаватага ў непапраўнай і крывавай афганскай трагедыі. Хто вінаваты ў бойні, якая за 10 гадоў свайго інтэрнацыянальнага існавання пазбавіла жыццяў невядомую колькасць сваіх маладых сыноў.

Тагачасныя ўласныя погляды на афганскую вайну я занатаваў у сваім дзённіку. Частка з яго друкавалася асобнай кніжкай пад назваю "Горкі пыл Гіндукуша". Мае погляды на тую вайну не змяніліся і сёння. Наадварот, яны зрабіліся больш сталымі і сур'ёзнымі. За 20 гадоў у мяне хапіла часу, каб асэнсаваць, узважыць усе "за" і "супраць". Я ўпэўнены, што савецкія палітыкі былі зусім сляпымі. Яны не ведалі і не хацелі ведаць гісторыю гераічнага афганскага народа. Савецкі Саюз пачаў вучыць Афганістан, як трэба жыць, як трэба будаваць сацыялізм... А народ Афганістана і палітычны клімат краіны, не гаворачы ўжо пра яго эканамічны стан, і сёння не падрыхтаваны да гае рэвалюцыі. Там уладарыць феадалізм. Там на практыцы яшчэ не скончылася XIII стагоддзе.

Выканаўшы ўласнымі спецпадраздзяленнямі пераварот у Афганістане, Савецкі Саюз не прынёс краіне свабоду і шчасце. "Шураві" разварушылі чалавечы мурашнік, азлобілі жыхароў былой дружалюбнай краіны ў адносінах паміж сабою і ў тым ліку да СССР. Так распачалася ў Афганістане грамадзянская вайна і ў яе пашчы аказалася наша 100-тысячная 40-я армія. Не скончылася вайна і пасля вываду савецкіх часцей, а набрала такую моц, што цяпер, бадай, немагчыма прадбачыць ці прадказаць яе канец. І нічога дзіўнага ў тым няма. Рэдка хто з людзей вучыцца жыць на чужых памылках. Таму і мы не вучыліся на памылках Англіі ў вайне з Афганістанам, Амерыкі — у вайне з В'етнамам і на памылках іншых краін у лакальных войнах. Запамяталі мы, што Усход — справа тонкая, а афганцы — народ ганаровы. Сустрэнеш бедняка ці жабрака — не падавай выгляду, што лічыш іх такімі... Пакрыўдзіш...

Беларуская пісьменніца Святлана Алексіевіч у сваёй кнізе "Цынкавыя хлопчыкі" паказала нас, удзельнікаў афганскай кампаніі, як забойцаў, наркаманаў, насільнікаў і г. д. Я лічу, што за тое не трэба крыўдзіцца на Алексіевіч. Па-першае, яна жанчына. Па-другое, яна пісьменніца журналісцкай "хваткі". Па трэцяе, яна сенсацыі. "У вайны не жаночы твар" — сенсацыя. "Цынкавыя хлопчыкі" — сенсацыя. Цяпер яна рыхтуе да выдання новую сенсацыю — твор пра тых, хто пацярпеў ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. І ўсё гэта яна робіць не таму, што паважае і любіць сваіх герояў, а таму, відаць, што любіць славу і прагне яе... Бог дарује ёй за тое, што яна ў сваіх творах толькі ўмее варушыць чалавечую памяць, распальваць і ўзмацняць і без таго моцны і несуцішны боль. Алексіевіч не была на вайне. Яна толькі размаўляла з яе ўдзельнікамі, трымаючы ў руцэ мікрафон. А са шчырага прызнання людзей выбрала тое, што лічыла неабходным для сенсацыі. Аднак Алексіевіч і ўсе тыя, хто мяркуе пра нас, "афганцаў", так як яна, некалі павінны ўсё ж зразумець, што салдаты — гэта ахвяры любой вайны. Яны выконваюць свой абавязак, загады камандзіраў і начальнікаў, якія аддаюць іх ад імя Радзімы. Так патрабуе вайсковы Статут. Так было ва ўсе часы. Так будзе. На афганскай вайне чалавек праходзіў праз такія выпрабаванні, што я, яе ўдзельнік, нават сёння часам жахаюся, успамінаючы тыя падзеі.

Сёння я лічу, што кожны сумленны чалавек можа толькі падзякаваць "афганцам" за тое, што яны чэсна выканалі свой салдацкі абавязак і, вярнуўшыся да мірных будняў, вучаць моладзь любіць сваю Радзіму, свой народ. Вучаць быць патрыётамі, а не здраднікамі.

Ніхто з нас не вінаваты ў той вайне, але пасля вяртання з яе нашы хлопцы неаднойчы паспыталі на сабе колкія і балючыя папрокі некаторых чыноўнікаў: "Я цябе туды не пасылаў..." У свой адрас я не чуў такога. А калі б пачуў, дык далібог сказаў бы: "А я цябе паслаў бы абавязкова..." Такія, звычайна, не вярталіся дамоў жывымі. У крайнім выпадку іх знаходзіла шалёная куля...

15 лютага — не свята, а дзень памяці і бясконцага, несуцішнага чалавечага болю. Болю ад фізічных і маральных ран, што не загаіліся, баляць і будуць балець да канца нашых дзён. Для мяне і сёння слова "афган" асацыіруецца з пахам крыві і горным пахам чаромхі — пахам смерці. Праўдзіва напісаў некалі мой сябра слонімскі паэт Рудольф Пастухоў у адным са сваіх вершаў, прысвечаным воінам-"афганцам":

*...Чтобы не страдали ваши души,*
*Чтобы от несчастья их спасти,*
*Не везите в горы Гиндукуша*
*Русскую черемуху цвести.*
*Для цветов нет места на войне —*
*Задохнутся в крови и огне.*

Светлая памяць і мой нізкі паклон усім, хто загінуў на афганскай вайне. Нізкі зямны паклон і вам, салдацкія бацькі, хто не дачакаўся сваіх сыноў жывымі. Няхай жыве і будзе жыць вечна людская памяць аб іх... Несуцішны боль у душах "афганцаў"...

**Іван СЯРГЕЙЧЫК.**

В НАШЕЙ ПАМЯТИ

# ПОСЛЕДНИЙ БОЙ ИВАНА ЛУКЬЯНОВИЧА

**17 августа ему исполнилось бы 60 лет со дня рождения. Слонимский писатель, член Союза белорусских писателей, воин-интернационалист Иван Лукьянович Сергейчик жил по совести.**



## ПРАВДОЛЮБ

В моей памяти Иван Лукьянович навсегда останется справедливым и мужественным человеком с военной выправкой, крепким мужским рукопожатием и проницательным взглядом умных глаз. От него веяло спокойствием и уверенностью, ему хотелось довериться, как родному отцу, но были моменты, когда его задевали за живое, кровное, родное... Тогда Сергейчик "вспыхивал и бросался в бой", был готов отстаивать свою точку зрения до конца, был готов защищать незаслуженно обиженных и никогда не шел вразрез со своей совестью.

## ТИМУР И ЕГО КОМАНДА

Детство Иван Лукьянович провел в деревнях Пустоборы и Острово Зельвенского района. Друзья Вани Сергейчика вспоминают, что он всегда был смелым и жизнерадостным, изобретательным и предприимчивым мальчиком. Рядом с ним всегда было интересно, безопасно и весело. Ваня всегда знал, где есть ягодные и грибные места в окрестных лесах, знал все дворы и сараи в деревне, знал в чьем саду вкуснее яблоки, груши и сливы. Он был заводилой, настоящим вожаком детворы, как знаменитый гайдаровский Тимур.

## ВОИН-ИНТЕРНАЦИОНАЛИСТ

Лидерский характер Ивана Лукьяновича в полной мере проявился во время войны в Афганистане, участником которой он был с 1981 по 83 и в 1989 гг. За мужество и героизм, проявленные в боях с врагом, Сергейчик был награжден орденом Красной Звезды и боевыми медалями. Однополчане и после войны видели в Лукьяновиче "командира", не зря он три года возглавлял Слонимское районное объединение ветеранов войны в Афганистане. Многие рассказы и повести Сергейчика посвящены афганской теме.

## НАСТАВНИК МОЛОДЕЖИ

Многие школьники знали Сергейчика, не только как талантливого писателя, своей военной прозой продолжавшего лучшие традиции Василя Быкова и других белорусских писателей, но и как умного, отзывчивого человека, всегда готового помочь, поделиться опытом. Он часто бывал в школах города, выступал на торжественных линейках и классных часах. Иван Лукьянович написал много интересных статей о юных талантах Слонимщины, выпустил книгу "Сцяжынка школьная мая".

## БОЛЬШЕ ЧЕМ ПОЭТ

Меня всегда удивляла способность Сергейчика переживать и сопереживать другим, готовность стать на защиту "униженных и оскорбленных", вступить в бой за идею. Таким людям сложно жить. Они сгорают в собственном пламени, как свечки... Уже три года, как Ивана Лукьяновича нет рядом с нами, но отрадно, что осталась добрая память, что живы его книги.

"Пра ўсіх, хто не вярнуўся з бою, — писал Иван Лукьянович в предисловии к книге "Без права на літасць", — помніце ўсе тыя, хто вярнуўся жывымі, хто жыве. І пры жыцці сваім зрабіце ўсё магчымае, каб памяць аб іх стала вечнай."

**Игорь Прокофьев,**
**член Слонимского литобъединения им. А.Иверса при газете "Слонімскі веснік".**

# СЛОНІМСКІ ВЕСНІК

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Заснавана 20 верасня 1939 г.

20 ЧЭРВЕНЯ 2006 ГОДА * № 70(9566) • КОШТ У РОЗНІЦУ ДАГАВОРНЫ • ТЫРАЖ 145 ТЫСЯЧ У МЕСЯЦ

## НАЗАЎСЁДЫ Ў ПАМЯЦІ



Не стала вядомага, паважанага чалавека, члена Саюза пісьменнікаў Івана Лук'янавіча Сяргейчыка. Ён памёр у расквіце творчых здольнасцей, у перыяд працы над творчымі задумкамі.

Іван Лук'янавіч Сяргейчык нарадзіўся 17 жніўня 1949 года ў вёсцы Пустаборы суседняга Зэльвенскага раёна. Шмат гадоў жыў у Слоніме, тут працяглы час служыў у арміі, адсюль быў накіраваны ў Афганістан, прымаў там удзел у баявых дзеяннях, адзначаны баявымі ўзнагародамі.

Пасля Афганістана выдаў кнігу "Горкі пыл Гіндукуша". Яго творы змяшчаліся ў часопісе "Маладосць", у розных рэспубліканскіх і абласной газетах. Ён увесь час падтрымліваў творчыя сувязі з нашай газетай, тут друкаваліся многія яго творы.

Асабліва плённа працаваў І.Л. Сяргейчык у апошнія гады. Па яго ініцыятыве выдадзены ў Слонімскай друкарні літаратурны альманах "Пад гукі паланэза" і своеасаблівы зборнік апавядаў пра адораных і таленавітых дзяцей.

Дарэчы, у друкарні ён пэўны час працаваў, тут жа і выдаў названыя кнігі. У апошні час быў у штаце пазашкольнай навучальна-выхаваўчай установе "Скарбніца", падрыхтаваў да выдання кнігу "Без права на літасць", якая складзена з твораў адораных дзяцей. Верыцца, што гэта кніга хутка ўбачыць свет, аб чым паклапоцяцца нашы чулыя і ўважлівыя землякі, прыкладуць для гэтага свае намаганні.

Нашы землякі будуць заўсёды помніць гэтага таленавітага і вядомага чалавека. Выказваем шчырыя спачуванні родным і блізкім.

Іван Лук'янавіч Сяргейчык застанецца ў нашай памяці на ўсё жыццё. Памяць аб ім будзе вечнай у гісторыі Слонімшчыны.

**Калектыў рэдакцыі газеты "Слонімскі веснік".**
**Члены літаб'яднання імя А. Іверса пры газеце "СВ".**

4.05.2007.

# «Стихи живут — и я живу на свете!..»



**В актовом зале ЦДТ «Скарбніца» прошла презентация книги «Без права на літасць» слонимского писателя, члена союза писателей Беларуси, руководителя Слонимского литературного объединения имени А. Иверса, при газете «Слонімскі веснік» И.Л. СЕРГЕЙЧИКА.**



Скоро год, как Ивана Лукьяновича нет с нами, но вместе с его стихами и песнями, его повестями и рассказами память о нем живет и сохраняется в сердцах благодарных слонимчан. Свидетельство этому — прошедшее мероприятие, в котором приняли участие друзья Ивана Лукьяновича, его близкие, коллеги и ученики, а так же многочисленная армия поклонников его таланта. Над книгой «Без права на літасць», повествующей о событиях Афганской войны 1980-89 гг., автор работал последние годы своей жизни. Она состоит из афганского дневника 1981-82 гг., двух повестей и двух коротких рассказов. Выход книги и ее презентация состоялись благодаря поддержке друзей и соратников писателя. В актовом зале присутствовали воины-интернационалисты, библиотекари, учителя, учащиеся школ города, ребята из кружка «Милосердие» и других кружков ЦДТ «Скарбніца». Мероприятие открыла руководитель Слонимского литературного объединения имени А. Иверса при газете «Слонімскі веснік» Ирина Антоновна Войтко, которая рассказала о истории издания последней книги Ивана Лукьяновича. Далее на презентации звучали стихи и песни Ивана Сергейчика, отрывки из книги «Без права на літасць» и выступления тех, кто ждал эту книгу. В конце мероприятия жена Ивана Сергейчика Валентина Кирилловна поблагодарила всех присутствующих за помощь в издании последней книги мужа, в организации презентации и за светлую память об Иване Лукьяновиче.

**P.S.:** *Не смотря на печальные обстоятельства, долгожданная книга все-таки увидела свет и это вселяет радость. Пока живут книги, будет с нами и наш земляк, талантливый писатель Иван Лукьянович Сергейчик.*

**Игорь Прокофьев.**
**Кирилл Лященко (фото).**



**Іван СЯРГЕЙЧЫК**
**(1949 – 2006)**

*Пад творам Івана Сяргейчыка "Горкая пяшчота" стаіць дата – люты 1985 года. З таго часу прайшло нямала гадоў, але апавяданне-быль кранае душу і сёння.*

## Горкая пяшчота

Пасля начной завірухі ранак выдаўся неспадзяваным. Сонца нібы спазнялася. Яно прыхарошвалася недзе за лесам у белаватай смузе. Вулічныя абсады – клёны, таполі і бярозкі, – голле якіх спрэс абложана снегам, спагадліва пазіралі на замеценыя завірухай кусты, бо як асядзе снег – абломіць, знішчыць усю прыгажосць. І тады жыві, як хочаш. Альбо чахні ад тугі і суму, альбо аддавай усю моц пасынкам. Пачынаць жа новае жыццё – адно і тое ж, што замест зерня слёзы сеяць. Што ўзыдзе? Ды ці ўзыдзе што?

Загледзеўшы людзей, асады сыпалі на іх галовы снежнай пацярухай: спыніся, чалавеча, не праходзь міма бяды чужой. Спыніся…

Ішлі гараджане, спяшаліся хто куды, бо чужая бяда, як іржавая вада – нікому не патрэбна. А тым часам з ваеннага гарадка на гарадскую вуліцу выцягвалася калона армейцаў. Паперадзе, як належыць, адлічваў крок аркестр. Вулічны рух прыпыніўся. Нецярплівыя легкавушкі, грузавікі і аўтобусы цііснуліся да тратуараў і, стоячы там, тарахцелі маторамі. Праз шыбіны вокнаў на вайскоўцаў з цікавасцю пазіралі людзі. Над вуліцай чуўся хрыплівы такт салдацкіх крокаў.

Данеслася музыка – калона падыходзіла да плошчы. У страі падраўняліся.

Ажылі тратуары. Людзі, ствараючы шчыльны ланцужок, не адрываючыся, цёплымі позіркамі глядзелі на армейскі строй.

На плошчы калона скіравала ўлева. Мінула ўзлобак, пасярод якога высіўся помнік, атулены маладымі ліпамі. Абапал помніка – ганаровая варта: салдаты, піянеры, збоч – ветэраны, а навокал – жывое людское мора.

Дзесьці за скрыжаваннем калона развярнулася і спынілася насупраць помніка.

Непадалёку, на тратуары, стаяла невысокая маладжавая жанчына. На дробным маршчыністым яе твары відзён быў неспакой. З-пад цёмнай хусткі рассыпаліся густыя пасмы сівізны, а вочы, цёмныя і глыбокія, акружаныя падкоўкамі маршчынак, быццам кагосьці шукалі сярод строю.

– …Людская памяць не ведае вымярэнняў. З кожным годам радзеюць нашы рады, на скронях становіцца больш сівізны, а на сэрцы – болю.., – ліўся з рэпрадуктара голас ветэрана.

Жанчына, напэўна, не чула гэтых слоў. Крыху схіліўшы галаву, непрыкметным узмахам рукі яна схавала пад хустку непаслухмяныя пасмы валасоў. І тут грымнуў салют. Скаланулася паветра. З таполяў пасыпаўся іскрысты снег. Ён слаўся на галавы, плечы, дробнымі кроплямі вады казытліва астуджваў твары. Хто паспеў – адхіляўся ўбок, хто атрасаўся, а яна стаяла нерухома, накіраваўшы позірк на высокага стройнага салдата ў першай шарэнзе строю. І раптам заплакала. Салдаты паглядзелі на яе.

Жанчына стаяла, прытуліўшыся да дрэва, і рукамі закрывала твар. Худыя плечы ўздрыгвалі ўсё часцей і часцей.

Падбегла нейкая дзяўчына, пачала супакойваць, нешта гаварыць.

Жанчына не слухала яе. Яна падняла галаву і, выцягнуўшы шыю, зноў зірнула на салдацкі строй. Затуманены позірк яе спыніўся на тым жа салдаце. Штосьці напружана прашапталі яе вусны.

У страі заўважылі жанчыну. Ціхі шэпт пракаціўся па калонах і шарэнгах. Салдат нечакана здрыгануўся, праглынуўшы камяк жалю, кашлянуў, выйшаў са строю і хутка накіраваўся да жанчыны. Афіцэр, які стаяў наперадзе, наважыўся нешта сказаць наўздагон салдату, але сусед спыніў яго, паклаўшы руку на плячо.

Доўгая яловая вітая гірлянда плыла на руках да помніка.

З жаночых вачэй нястрымна ліліся слёзы. Яна выцягнула з рукава паліто хусцінку і пачала выціраць твар. Салдат быў ужо побач, і яна імкліва зрабіла крок яму насустрач.

Яны стаялі на тратуары – маленькая жанчына і высокі салдат, пагружаныя ў свае пачуцці і роздум. Жанчына пяшчотна гладзіла рукамі шэры салдацкі шынель. А навокал было чутна, як шмыгалі людзі насамі.

– Чаго яна?

– Сустрэла сына?

– Загінуў сын яе. У Афганістане.

Некаторыя паціскалі плячыма. Іншыя праслязіліся.

Зноў грымнуў салют. Жанчына здрыганулася.

– Сы-но-чак, сын-ку, пойдзем дамоў… Пойдзем жа... – спалохана паклікала яна.

Салдат абняў жанчыну за плечы. Натоўп расступіўся, прапускаючы іх.

У трэці раз скалануў паветра салют, аддаючыся прыглушаным рэхам на лютаўскіх вуліцах і завулках.

*Слонім. Люты 1985 года*

## Песня пра Слонім

Горад мой, ты жывеш пад сузор'ем надзеі і шчасця.
У будні дзён веліч працы радкамі ўпісваеш сам.
Будаўнік твой партрэт змог цаглінкамі гонару скласці,
А захоўваць яго мужным дочкам тваім і сынам.

Слонім наш, родны наш, мы табе ўсё жыццё прысвячаем.
І, як птаху, жадаем моцных крылаў у палётах тваіх.
Няхай макі цвітуць там, дзе насмерць салдаты стаялі.
Макі – сімвал павагі да справаў тваіх баявых.

Вечнасць у парку тваім мужным ліпам расчэсвае косы,
Млечны шлях акунуўся ў хвалі канала твайго.
І гучыць "Паланэз", настальгію купаючы ў росах,
То Агінскаму гімн ад шматлікіх нашчадкаў яго.

На шляхах, між дуброў, не аднойчы заставы ўставалі.
Успыхваў іскрамі меч у руках абаронцы твайго.
Твае, бацька, сыны- наймацнейшыя пробы са сталі,
У абеліcках застылі, як гонар народа майго.

## Сэрца малой радзімы

Месяцам мечаны вечар
Песціцца ў дымцы лагоднай.
Слонім мяне на сустрэчу
Кліча пасля паходаў.

І дзе б ні быў, у час растанні,
Прагну з табою спаткання.
Сэрца малой радзімы маёй –
Калыска майго кахання.

Ад шчасця плыву між ліпкамі,
Ног пад сабою не чую.
Квеценем шчодра асыпаны
Слонім мяне чаруе.

Туліцца ясень з бярозкаю,
Нібы у іх час спаткання.
Мроіцца мне: прамаўляецца
У шэпце лістоты прызнанне.

Шчара, маці пяшчотная,
Зорачкі ў хвальках купае,
Нібы рукою дзявочаю,
Стужкай цябе абвівае.

Скарб маіх сноў юнацкіх,
Іду да цябе на спатканне.
Сэрца малой радзімы маёй –
Горад майго кахання.

Бор гоіць водарам раны мае
Пасля чарговых растанняў.
Ты – сэрца малой радзімы маёй –
Арэлі майго кахання.

* * *

Мой слаўны горад – помнік даўніны,
Сівых вякоў бясцэнная карцінка!
Я – твой мураш, тваёй зямлі пясчынка,
Нашчадак тых, хто не прыйшоў з вайны.

З табою лёс свой я заўжды дзялю.
Я – сын, і за цябе я гонар маю.
На шчасце я цябе благаслаўляю
Крывёю прашчураў палітую зямлю!

## Пошукі душы

Сам сабе я патрапіць ніяк не магу –
Не стасуюцца ява з жаданнем:
То ад лета ў восень ашалела бягу,
То зіме прызначаю спатканне.

Маладосць адшугалі на арэлях гады,
Сталасць скроні фарбуе рашуча.
Паглынула сумленне спакусаў сляды,
Роздум ветліва мудрасці вучыць.

Я вясну сустракаю ў віхурах надзей,
Сэрца прагне кахання, пяшчоты...
Спадзяюся, што лецейка з імі звядзе,
А трапляю пад дах адзіноты.

Аздабляе шчадротамі восені дар –
Душа просіцца ў вырай манлівы.
Толькі крылы не даў мне магутны Ўладар...
Мары чахнуць  прадзімкам санлівым.

Тры эцюды сыграла на арфе зіма –
Зноў на старце нязбытныя жарсці.
Зацугляць іх напорыстасць – сілы няма...
Дзе ж ты, у мроях узнёслае шчасце?..